# ГЕНАДЗЬ ПЯТРОВІЧ ПАШКОЎ



# БІЯГРАФІЯ:

Генадзь Пятровіч Пашкоў нарадзіўся 23 сакавіка 1948 г. у вёсцы Малыя Ліпавічы Чашніцкага раёна на Віцебшчыне ў сям'і служачых. Неўзабаве, на пачатку пяцідзесятых, сям'я пераехала на сталае месцажыхарства на Гродзеншчыну, таму дзяцінства, а пасля, па сутнасці, і ўсё юнацтва адзвінелі на смаргонскай зямлі (на сутыку з Вілейшчынай і Мядзельшчынай), на зялёным, у рабінавым атачэнні хутарку паблізу вёскі Войстам. Якраз педагагічная спецыяльнасць маці і стала прычынай пераезду сям'і на новае месцажыхарства, бо шмат якіх спецыялістаў у той час накіроўвалі ў заходнія раёны дапамагаць хутчэйшаму іх уздыму і цяснейшаму аб'яднанню з рэгіёнамі ўсходнімі. Жылі Пашковы як бы наводшыбе: паміж дзвюх вёсак. Маці працавала не ў той школе, дзе вучыўся сын, а ў васьмігодцы за сем кіламетраў, хадзіла туды і назад пешшу. І хлопчыку часта даводзілася быць аднаму — сам-насам з кнігамі. Г. Пашкоў уваходзіў у свет са сціплай хаткі, вакол якой заўсёды летам шумела, як мора, жыта, раслі ясень і гнуткія рабінкі. Войстам, дзе жыў і вучыўся паэт, мае сівую гісторыю, прычым пра вельмі даўняе яго паходжанне сведчыць гарадзішча сёмага стагоддзя да нашай эры. Бацьку Г. Пашкова, Пятра Трафімавіча, мужыка з моцнага і разумнага роду, скрышыла вайна, ён цяжка хварэў і найчасцей ляжаў па шпіталях. Маці, Марыі Харытонаўне, выпаў цяжкі лёс: за вайну страціла двух малалетніх дзетак, у трыццаць з нечым гадоў стала ўдавой і адна падымала, ставіла на крыло траіх дзяцей. Выхоўвала іх сумленнымі людзьмі, якія чужы боль успрымалі душою.

# ДАПАМОГА СЯБРОЎСКАМУ НАРОДУ

- Дзесьці ў шасцідзесятыя гады, калі амерыканцы палілі напалмам в'етнамскія джунглі, дзевяцікласнік Г. Пашкоў надумаў падацца ў добраахвотнікі, старанна напісаўшы на імя раённага ваенкома заяву-просьбу паслаць на дапамогу сяброўскаму народу. Агледзеўшы яго з ног да галавы і насмешліва чмыхнуўшы, маёр параіў закончыць інстытут. Апошнія словы, як кіпенем, ашпарылі, бо ў будучым «добраахвотнік» бачыў сябе выключна вайскоўцам. Праўда, было ў юнака і захапленне словам: ён друкаваў свае допісы ў раённай газеце «Светлы шлях». Напачатку — празаічныя, пасля — вершаваныя. Вершы пачаў пісаць, як прызнаецца сам творца, ужо добра начытаўшыся. Садзейнічаў жаданню пісаць прыклад здольнага паэта Івана Станкевіча, які вучыўся ў адной школе з ім і паступіў на філалагічны факультэт. У 1966 г. Г. Пашкоў скончыў Войстамскую сярэднюю школу і таксама стаў студэнтам Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

# ГЕНАДЗЬ ПАШКОЎ — ПАЭТ…

- Генадзь Пашкоў — паэт-«сямідзесятнік», прадстаўнік пакалення, якое часам незаслужана папракаюць за нязначнасць мастацкіх адкрыццяў, за сузіральна-краявідную апісальнасць, быццам не ў час выкрасанае трапяткое слоўца. А між тым паэзія-берагіня адорвала яго цудатворным уменнем слухаць зямлю, з глыбінных нетраў якой нашэптавалася невытлумачальная ўлюбёнасць да гаючай празрыстай кроплі кляновіка, да гравюр дарог, да медунічных вятроў, да журавінавага вострава, да светлай журбы радзімай зямелькі.
  Г. Пашкоў — творца ад зямлі, і зямное прыцяжэнне — бадай, адна з вызначальных катэгорый паэтавага мыслення, паэтавай споведзі. Звабнае спасціжэнне зямнога паўшэпту чуецца яму ля Чашнікаў, дзе нарадзіўся; ля Смаргоні, дзе вырас; чуецца і на Палессі, дзе не адну сотню кіламетраў прайшоў на вёслах па Гарыні і Прыпяці.
  Першыя вершы паэта пабачылі свет у калектыўным зборніку маладых універсітэцкіх паэтаў «Узлёт» (1967). Студэнцкія гады былі вясёлыя: з паездкай на цаліну, з цікавай практыкай у газетах, на радыё. Тады ўпершыню сутыкнуўся з бюракратыяй, з яе вечным імкненнем навязаць журналісту, як і пра што трэба пісаць. У 1971 г. скончыў факультэт журналістыкі, ужо стала працуючы ў рэдакцыі літаратурна-драматычных перадач для дзяцей і юнацтва Рэспубліканскага радыё.



# ПРАЦА

- Па збегу акалічнасцей у адзін і той жа жнівеньскі дзень 1972 г. атрымаў адразу два запрашэнні на працу — у рэдакцыю часопіса «Полымя» і ў штотыднёвік «Літаратура і мастацтва». Абраўшы «Полымя», працаваў літаратурным супрацоўнікам на два аддзелы — паэзіі, які ўзначальваў Анатоль Вялюгін, і нарыса з публіцыстыкай — на чале з Іванам Чыгрынавым. Выконваючы даручэнне галоўнага рэдактара Кастуся Кірэенкі «падняць» рабочую тэматыку ў часопісе, надрукаваў шэраг нарысаў, якія пасля склалі кнігу «Будзень як свята» (1977). Праўда, дэбютаваў у літаратуры Г. Пашкоў усё ж кнігай паэзіі «Кляновік» (1975). У 1979 г. ён стаў намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Полымя», а ў канцы 80-х гадоў быў абраны сакратаром партыйнай арганізацыі Саюза пісьменнікаў, не пакідаючы пасады ў «Полымі». З 1989 г. працаваў кансультантам гуманітарнага аддзела ў апараце ЦК КПБ. Як вядома, гэта быў час крутой раскруткі «перабудовы», і пісьменніцкая арганізацыя настойліва ўцягвалася ў палітычны вір. «Часта мы самі таго не заўважаючы, пілавалі сук, на якім утульна сядзелі. Колькі выліслі слоў, колькі энергіі перакіпела! — успамінае Генадзь Пятровіч. — Ёсць што ўзважыць, ёсць пра што згадаць, і ў гэтым сэнсе я нават удзячны лёсу, што са жніўня 1989 г. па жнівень 1991 апынуўся на караблі, які цярпеў крушэнне. І нават у якасці сціплага кансультанта гуманітарнага аддзела ЦК КПБ я меў магчымасць больш выразна адчуць некаторыя з'явы той пары, убачыць пэўныя сістэмы іх, распазнаць канкрэтных выканаўцаў».

- З лютага 1996 г. Г. Пашкоў — галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя», а перад тым быў намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Тэатральная Беларусь», рэдагаваў недзяржаўную «Цэнтральную газету». Падрыхтоўка фундаментальных энцыклапедычных і даведачных выданняў, якія разлічаны на дзесяцігоддзі і не могуць паддавацца хутказменнай кан'юнктуры часу, цалкам ахапіла яго. Па сутнасці, побач з творчасцю гэтая праца стала асноўным сэнсам яго жыцця. Нягледзячы на вялікую адміністрацыйна-службовую занятасць, Генадзь Пашкоў актыўна працуе на творчай ніве



# ТВОРЧАСЦЬ:

- Апроч ужо згаданых паэтычнай кнігі «Кляновік», зборніка нарысаў «Будзень як свята», яго пяру належыць шэраг высокамастацкіх кніг самага рознага жанравага дыяпазону: «Дыстанцыя небяспекі» (1979), «Гравюры дарог» (1981), «Зямлю слухаю» (1983), «Маналог на кастрышчы» (1986), «Крокі» (1988), «Люблю, спадзяюся, жыву...» (1990), «Журавінавы востраў» (1998), «Палескія вандроўнікі» (1998). Выйшлі таксама зборнікі паэзіі для дзяцей «Дзяўчынка з блакітным мячыкам» (1986), «Пціч» (1991), «Зорнае поле» (1999). Ён адзін з аўтараў дакументальнага фільма «Я зямлю люблю так...»



# АНАЛІЗ :

**Молада-акрылена Г.Пашкоў заявіў пра сябе ўжо першай паэтычнай кнігай з мілагучнай, салодкай назвай «Кляновік»(1975)*. Маладога аўтара ўжо тады захапляла непаўторная прыгажосць роднай прыроды, пэўная ўсхваляванасць за цішыню, якая дрыжыць павуцінкай, здзіўленне ад васілька, які «*над галавой бязвоблачным гайдаўся небам*» і «*мільярдам сонечных расінак сінее ў жыце*». Рамантычна-ўзнёслы лірычны герой прагнуў спазнаць неспазнанае, і прага гэтая была найперш першароднa-ачышчальная:**

***І мне здавалася, што зноў***

***я пачынаю жыць спачатку,***

***зрываць з усіх першаасноў***

***іх таямнічную пячатку.***

«Кляновік» акрэсліў вызначальны вобраз паэтавага мыслення — вобраз зямлі. Паэт пачынаў з традыцыйнай манеры пісьма, са знаёмага з дзяцінства багатага рэчыўнага свету («*Задумліва прыціхлі хаты, // трымаючы слупы дамоў*», «*пявун крылом дрымоту сіпла выцяў*»), з пачуццёва-асабістага пра парэпінкі на матчыным твары ды запамінальны пах бацькавай салдацкай гімнасцёркі, з дасціпна-назіральнага, «*дзе ручаінка // на глыбокім донцы // хавае кветкі сонечны спакой*». Але ўсё ж невытлумачальнае зямное прыцяжэнне акрыляла яго думку, умацоўвала пачуццё вернасці і адказнасці. І як трэба было па-сапраўднаму адчуваць жывое-роднае, каб так упэўнена, нават напорыста, праграмна сцвердзіць сваю жыццёвую заручонасць з «*зямлёй маёй, зялёнаю расінкай*», ды яшчэ — «*маёй*», у якой чуецца глыбокая адказнасць за роднасць і жыццё. Беражліва збіраючы шматфарбныя колеры і шматгалосыя гукі, паэт, акрылены вясной, чуе — «*пчалой гудзе // Світальная галінка // і пахне // праталінай лясной*». Бо ў ёй — зямлі — існае і крэўнае, плоцевае і ўзвышанае, трывушчае і спадчыннае. Бо не забыць, што «*бацька // з прагай зямною // хацеў перад боем жыць*» (в. «Пачатак»). Таму Г.Пашкоў напаўшэпт спавядальна, урачыста-свята прызнаецца ва ўлюбёнасці, у непарушнай знітаванасці з зямлёй-маці:

*Зямля мая*

*зялёная расінка,*

*і чую я,*

*акрылены вясной, -*

*пчалой гудзе*

*світальная галінка*

*і пахне дзень*

*праталінай вясной.*

Схільнасць да лірычна-маляўнічага жывыпісу, ахутаная асаблівай сыноўняй, грамадзянска-гаспадарскай заклапочанасцю за лёс зямлі — «*зялёнай расінкі*» — «апазнавальны знак» мастацкага почырку Генадзя Пашкова. Ён «спрабуе слова і на «смак» гучання, і на яго зрокавы эфект» , — пісаў К.Камейша.

**Такі ён, Генадзь Пашкоў, на творчым рахунку якога звыш дзесяці зборнікаў вершаў, публіцыстыкі і кніг для дзяцей. Відаць, нездарма ў паэтычным мысленні Г.Пашкова, бы роднасна-зніταваныя, вельмі тонка, гожа пераплецены слоўцы *журавінавы* і *жураўліны.* Ды і сам «Журавінавы востраў» (1998) — адна з апошніх кніг паэта — «*То – дарунак ад Зямлі і Неба, // То — бальзам для цела і душы*» [2, с. 160]. Гэта якраз тое, што гаючым бальзамам кладзецца на душу кожнага, хто даражыць Бацькаўшчынай і для каго няма на свеце і быць не можа лепшай зямлі.**

***Я пажыў даволі ў гэтым свеце.***

***І яшчэ,***

***дасць Божа,***

***пажыву.***

***Адпускаю птушкаю на вецер***

***з ціхім смуткам светлую душу.***

***Не шукайце вольнага на волі.***

***Вы мяне не знойдзеце нідзе.***

***Туманом сыду ў наваколле.***

***Не пакіну следу на вадзе.***

***У сутонні, водарам налітым,***

***прыпыню, здарожаны, хаду.***

***І да траваў хмельна-варажбітных***

***У шчаслівай стоме прыпаду...*** [4, с. 100]

**Элегічна-спавядальным падаецца роздум паэта над асабістым восеньскім трызненнем, жыццёвым тлумам — над тым, што перажывае сёння сам паэт і яго пакаленне.**